

# Матэрыяльнае багацце базуецца на духоўным

**27 лютага адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам міністра культуры Уладзіміра Матвейчука. У парадак дня былі ўключаны восем пытанняў, якія тычыліся розных напрамкаў дзейнасці міністэрства і падначаленых яму арганізацый.**

Першым пунктам стаяла пытанне "Аб ходзе выканання работ па мастацкім афармленні новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі".

На калегіі абмяркоўваліся таксама наступныя пытанні: аб ходзе рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта Ркпублікі Беларусь па развіцці кінавідэагаліны; аб выкананні дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы ў 2005 г. і задачах на 2006 г. і інш.

З адпаведным дакладам выступіў дырэктар УП "Скульптурны камбінат", адзін з аўтараў генеральнага рашэння мастацкага афармлення будынка бібліятэкі Алесь Дранец.

У ходзе дыскусіі выступілі старшыні творчых секцый Беларускага саюза мастакоў, першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка, старшыня Савета па распрацоўцы канцэпцыі мастацкага афармлення будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Іван Міско і інш.

Было падкрэслена, што асноўны аб'ём работ па мастацкім афармленні будынка выкананы. У той жа час занадта доўгі працэс узгаднення эскізных праектаў прывёў да зрыву тэрмінаў прадстаўлення кардонаў у натуральную велічыню. Але гэты фактар, падкрэсліў міністр культуры, не павінен ніякім чынам уплываць на выніковы тэрмін увасаблення твораў выяўленчага мастацтва ў матэрыяле. Уладзімір Матвейчук патрабаваў ад упраўленняў і аддзелаў міністэрства дакладнай, зладжанай, своечасовай каардынацыі работы з зацікаўленымі арганізацыямі і прадпрыемствамі адносна вызначаных тэрмінаў заканчэння мастацкіх работ і іх высокага ўзроўню. Міністр падкрэсліў, што ў афармленні чытальных залаў бібліятэкі павінны быць прадстаўлены і лепшыя творы мастакоў усіх рэгіёнаў краіны.

* * *

"Аб ходзе рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па развіцці кінавідэагаліны" — такой была тэма другога пытання, якое разглядалася на калегіі. У размове прынялі ўдзел кіраўнік Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Аляксандр Яфрэмаў, дырэктар Белвідэацэнтра Іван Колб, кіраўнікі кінапракатных арганізацый, начальнікі ўпраўленняў і аддзелаў, спецыялісты ўпраўлення кінавідэамастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

З дакладам выступіў Уладзімір Рылатка, які зазначыў, што кінематаграфія краіны, дзякуючы захаванню вытворчасці кінавідэапрадукцыі і развіццю тэлеканалаў, з'яўляецца сёння самым даступным для насельніцтва відам мастацтва і моцным інструментам інтэлектуальнага і маральнага ўздзеяння на глядацкую аўдыторыю.

Вялікую ўвагу развіццю галіны надае кіраўнікдзяржавы. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусьса студзеня 2001 года па люты 2006 года дадзена 59 даручэнняў. На сённяшні дзень 45 з іх выкананы, астатнія носяць доўгатэрміны характар і будуць у бліжэйшай перспектыве рэалізаваныя — падкрэсліў У. Рылатка. Мерапрыемствы, які былі ажыццёўлены, дазволілі вырашыць шэраг асноўных пытанняў: забеспячэнне выпуску кінавідэапрадукцыі па дзяржаўна-творчай замове; засваенне вытворчасці тэлесерыялаў; развіццё новых відаў паслуг для насельніцтва; пашырэнне відэапаказу і стварэнне ўмоў па ўкараненні ў кінатэатрах гукавых стандартаў "Долбі-стэрэа"; павелічэнне паказу беларускай кінавідэапрадукцыі на беларускіх тэлеканалах, на фестывалях і Днях кіно за мяжой; развіццё заканадаўчай і нарматыўнай базы кінавідэагаліны; падрыхтоўку маладых творчых працаўнікоў. Сёння можна смела сказаць, зазначыў першы намеснік міністра культуры РБ, што галіна атрымала ўстойлівае дынамічнае развіццё. Гэтаму садзейнічала прыняцце Закону "Аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь" і падпісанне Прэзідэнтам РБ Указа "Аб стварэнні дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь". Міністэрства культуры РБ падрыхтавала і зацвердзіла Палажэнне аб дэпартаменце, унесены змяненні і дапаўненні ў некаторыя прававыя акты ў адпаведнасці з Указам, вырашана пытанне аб прадастаўленні памяшканняў для дзейнасці дэпартамента.

Міністэрствам культуры РБ падрыхтаваны і прыняты Саветам Міністраў РБ пастановы па ўдасканаленні ўмоў аплаты працы работнікаў кінематаграфіі і павышэнні тарыфаў разрадаў працаўнікоў кінавідэапракатных і кінавідовішчных арганізацый. Плануецца аднавіць тэхнічную і тэхналагічную базу кінавідэавытворчасці, павысіць якасць прадукцыі. Да 2010 года прадугледжваецца правесці рэканструкцыю і рамонт комплексу будынкаў і збудаванняў тэхналагічнага прызначэння Нацыянальнай кінастуды "Беларусьфільм" і Беларускага відэацэнтра. Распрацавана Міжведамасная праграма падрыхтоўкі кадраў для кінавідэагаліны на 2006— 2015 гады, якая прадугледжвае аптымізацыю сістэмы арганізацыі навучання творчых спецыялістаў, развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

У.Рылатка адзначыў, што сума дзяржаўнай падтрымкі фільмавытворчасці штогод павялічваецца. На 2006 год прадугледжана 7,2 млрд. рублёў і 850 млн. рублёў на набыццё абсталявання, з іх 235 млн. рублёў — на капітальны рамонт.

Характарызуючы працу арганізацый кінавідэапракату, першы намеснік міністра культуры зазначыў, што за перыяд з 2001 па 2005 гады яны прафінансаваныя з бюджэту на суму 53,1 млрд. рублёў, найбольшую падтрымку атрымала Мінская вобласць— 11, 9 млрд. рублёў. Самыя нізкія паказальнікі ў Брэсцкай вобласці — 4,8 млрд. рублёў.

Генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама Васіль Коктыш паведаміў, што сталіца выканала ўсе даручэнні Прэзідэнта. Матэрыяльна-тэхнічная сённяя адпавядае сучасным патрабаванням. Набываемыя фільмы, якія дэманструюцца на вялікіх мінскіх кінаэкранах, адпавядаюць запатрабаванням гледачоў.

Міністр культуры падтрымаў прапанову ўдзельнікаў пасяджэння: на базе Мінска і Мінскай вобласці правесці семінар па абмену перадавым вопытам для спецыялістаў кінавідэапракату ўсіх абласцей Беларусі.

* * *

Аб выкананні Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы ў 2005 годзе і задачах на 2006 год зрабіў даклад начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння В. Рымашэўскі.

У 2005 годзе, адзначыў выступоўца, у адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай, Міністэрства культуры РБ засвоіла сродкаў у суме 22 163, 32 млн. рублёў. Будаўніча-мантажныя і рэстаўрацыйныя працы вяліся на аб'ектах: "Прыбудова да Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь", у Нясвіжскім палацава-паркавым ансамблі ХУІ-ХУІІІ стагоддзяў, замкавым комплексе гарадскога пасёлка Мір, палацы Пацёмкіна ў Крычаве, палацы Паскевіча ў Гомелі.

У межах інвестыцыйнай праграмы распрацоўвалася праектна-каштарысная дакументацыя па: рэстаўрацыі і рэканструкцыі помніка архітэктуры— будынка творчага аб'яднання "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь"; рэканструкцыі асноўных будынкаў Нацыянальнага мастацкага музея РБ па вуліцы Леніна, 20 і 22; рэканструкцыі Мінскага дзяржаўнага вучылішча імя А.К. Глебава па вуліцы Б. Хмяльніцкага, 5; рэканструкцыі інтэрната Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па вуліцы Сурганава, 14.

Сродкі ў суме 10955,1 млн. рублёў, якія былі выдаткаваны на будаўніцтва прыбудовы да Нацыянальнага мастацкага музея РБ, асвоеныя ў поўным аб'ёме. Акт прыёмкі аб'екта ў эксплуатацыю падпісаны 31 студзеня 2006 года.

В.Рымашэўскі таксама адзначыў, што сродкі ў суме 2000 млн. рублёў, якія пайшлі на рэстаўрацыю і рэканструкцыю Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь засвоены ў поўным аб'ёме. Распрацаваны і зацверджаны пастановай Савета Міністраў РБ ад 4 чэрвеня 2005 года N 595 архітэктурны праект. Дзеля ажыццяўлення функцый галаўнога забудоўшчыка па забеспячэнні рэстаўрацыі і рэканструкцыі аб'екта створана рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Дырэкцыя па рэстаўрацыі і рэканструкцыі помніка архітэктуры — будынка "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь".

Створана міжведамасная камісія па распрацоўцы дызайнерскага праекта знешняга афармлення помніка архітэктуры — Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

На 2006год у адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь выдаткавана сродкаў у суме 93561,166 млн. рублёў. Асноўная ўвага будзе нададзена 14 матэрыяльным каштоўным аб'ектам на якіх праводзілася і будзе далей весціся рэстаўрацыя і рэканструкцыя.